**ГУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за студзень 2018 г.

## Мерапрыемствы да святкавання 100-годдзя з дня ўтварэння БССР

**2 студзеня**

Літаратурна-гістарычная гадзіна «По страницам истории нашей» прайшла для навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. Супрацоўнікі бібліятэкі расказалі прысутным пра гісторыю ўтварэння БССР, пра асноўныя падзеі за 100 гадоў існавання рэспублікі, пра тое, які складаны і драматычны шлях развіцця прайшла Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка. Расказалі пра літаратараў, якія тварылі ў гэтыя гады: В. Быкава, У. Караткевіча, А. Куляшова, Р. Барадуліна, А. Адамовіча і іншых. Да мерапрыемства падрыхтаваны кніжная выстава і відэапрэзентацыя пад аднайменнай назвай «Страны моей минувшая эпоха».

ЦБ, 68 чал.

**11 студзеня**

У бібліятэцы адбыўся мультымедыйна-гістарычны экскурс «Беларусь - шлях праз гады». Бібліятэкар пазнаёміла з аглядам матэрыялаў друку ў тэматычнай кніжнай выставе «Мая малая радзіма - маё жыццё, мой лёс, маё каханне». Праведзены літаратурна-гістарычная віктарына па гісторыі БССР, дзе самыя актыўныя ўдзельнікі атрымалі салодкія пачастункі. Гістарычны экскурс скончыўся мастацкім нумарам у выкананні навучэнцаў школы мастацтваў.

Хідрынская ПБ, 35 чал.

**23 студзеня**

Ганаровымі гасцямі і экспертамі адкрытага дыялогу «Станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці» выступілі прадстаўнікі кіраўніцтва раёна і грамадскіх аб’яднанняў. Вяла мерапрыемства першы сакратар раённага камітэта ГА БРСМ Палявода М. А.

Вучні школ горада і моладзь прадпрыемстваў прынялі актыўны ўдзел у абмеркаванні пытанняў па тэме мерапрыемства. У завяршэнні адбылася «КВІЗ»-віктарына, прысвечаная 100-годдзю БССР. Да мерапрыемства падрыхтаваны выстава-панарама «Гісторыі слаўнай вялікія даты», прысвечаная знамянальнай даце.

ЦБ, 78 чал.

## Мерапрыемствы да Навагодніх свят і Ражства

**11 студзеня**

Удзельнікамі Каляднай сустрэчы «Льются звуки жизни, счастья и добра, озаряя мысли светом Рождества» сталі дзеці і іх бацькі. Госці ўдзельнічалі ў тэматычных гульнях, забавах, конкурсах. Бібліятэкар

расказала прысутным пра традыцыі святкавання Каляд у Гарадцы. Ўдзел у праграме вечара прынялі хор і выхаванцы Васкрэснай школы царквы і калектыў Гарадзецкага клуба. З віншаваннямі да гасцей звярнуўся настаяцель храма іерэй Георгій Чэрвякоўскі, які ўручыў калядныя падарункі юным удзельнікам мерапрыемства.

Гарадзецкі філіял, 120 чал.

**17 студзеня**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшлі Калядныя вячоркі «Зімовай святочнай парой», удзельнікамі якога сталі члены клуба «Золотые годы». Удзельнікі клуба даведаліся шмат цікавага пра гісторыю Новага года, аб старажытных славянскіх традыцыях святкавання Нараджэння Хрыстова, Каляд і Вадохрышча. Гасцям былі прапанаваны вясёлыя гульні, конкурсы, музычныя віншаванні, калядныя прадказанні. Прыемным падарункам для гасцей стала канцэртная праграма, падрыхтаваная вакальнай групай Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі. Завяршылася мерапрыемства святочным чаяваннем.

ЦБ, 48 чал.

**18 студзеня**

Залеская публічная бібліятэка сумесна з Цэнтрам культуры і вольнага часу і Васкрэснай школай правялі каляднае свята «Свет Рождества». Жыхарам і гасцям вёскі прадстаўлены тэатралізаваныя пастаноўкі «Рождественские чудеса», «Роза и кактус», народны абрад калядак і святочны канцэрт. Усіх прысутных павіншаваў са святам настаяцель Свята-Петрапаўлаўскага храма айцец Аляксандр, а дзецям уручыў калядныя падарункі.

Залеская, 120 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**11 студзеня**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшоў круглы стол па тэме «В стиле креатив: идеи для размышления», удзельнікамі якога сталі супрацоўнікі публічных бібліятэк раёна. Дырэктар бібліятэчнай сістэмы Легацюк Л. В. падвяла вынікі 2018 года. Прысутным прадэманстравана прэзентацыя на тэму «Проектная деятельность как способ привлечения к чтению». Затым адбыўся абмен вопытам паміж супрацоўнікамі публічных бібліятэк аб правядзенні галоўных мерапрыемстваў года.

ЦБ, 54 чал.

**15 студзеня**

У час правядзення літаратурна-музычнай кампазіцыи «Мой горад – мая любоў» навучэнцы 8-х класаў сярэдняй школы № 3 пазнаёміліся з гісторыяй Кобрына, даведаліся шмат цікавага пра славутасці горада, адказалі на пытанні віктарыны «Ці ты ведаеш горад Кобрын?». Відэафільм «Родны мой Кобрын» нагадаў прысутным пра самыя цікавыя мясціны роднага горада..

ЦБ, 72 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81